# 1 верасня Мінсувязі выпускае ў абарачэнне паштовы блок «500-годдзе беларускага кнігадрукавання»

1 верасня 2017 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовы блок «500-годдзе беларускага кнігадрукавання»

Мастак Т.Дольская. Дызайн М.Віткоўскай.

Блок друкаваўся ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц.Непагодзіна».

Мінула шмат стагоддзяў, пакуль у Беларусі з'явілася першая друкаваная кніга. Пачынальнікам кнігадрукавання сярод усходніх славян стаў Францыск Скарына, які ў 1517 годзе заснаваў у Празе друкарню і выдаў Псалтыр – першую друкаваную беларускую кнігу.
500-годдзе беларускага кнігадрукавання – дата сусветнай значнасці, унесеная ў Спіс памятных дат ЮНЕСКА.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

У аснове маркі – старонка з Псалтыра.

У дзень выпуску паштовага блока ў абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (магазін «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Падрабязнасці на сайце РУП «Белпошта»

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/30-08-2017-2205*